Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(70), 2012

*УДК 398.5*

# Артэфакты з чарадзейных казак як культурныя каштоўнасці беларускага этнасу

В.В. Ляўчук

У дадзеным артыкуле разглядаюцца артэфакты з чарадзейных казак як адлюстраванне каштоўнасцей беларускага этнасу. Аўтар вылучае асобныя артэфакты і на падставе іх функцый вызначае каштоўнасці: агульначалавечыя, выключна беларускія, персанальныя, сацыяльныя і г. д. Надаецца ўвага супастаўленню чароўных прадметаў розных народаў, знаходжанню агульнага і рознага. Такім чынам, робяцца высновы пра існаванне сістэмы каштоўнасцей у беларускай міфалогіі, яе старажытнасць, сувязь з паўсядзённай культурай этнасу і прыналежнасць да сусветных міфалагічных уяўленняў.
**Ключавыя словы:** артэфакт, светаўспрыманне, казка, міфалогія, культурныя каштоўнасці, станоўчыя каштоўнасці, антыкаштоўнасць, гістарычная памяць народа.

The article considers the artifacts presented in fairy tales as a reflection of the values of Belarusian ethnos. The author marks out some artifacts and on the basis of their functions determines human, solely Belarusian, personal, social and other values. The attention is paid to the comparison of different nations' magical objects, the definition of common and distinctive. Thus, the conclusions about the existence of system of values in the Belarusian mythology are made. There is emphasized its archaism, the connection with the ethnos everyday culture, and belonging to the world's mythological concepts.
**Keywords:** artifact, world outlook, tale, mythology, cultural values, positive values, anti-values, people's historical memory.

Міфалагічная тэматыка заўсёды вабіла ўвагу як навукоўцаў, так і звычайных чытачоў. Зразумела, што міф, легенда ці казка – гэта фрагмент светаўяўлення нашых далёкіх продкаў. Міфалогія не проста фантазія або фантом нясталага старажытнага розуму, а носьбіт нечага больш глыбокага, сутнаснага і цэльнага, для чаго хутчэй пасуе слова "жыццё" [1, с. 6], [9, с. 5], [10, с. 16]. Таму важна паспрабаваць пранікнуць у глыбіню народнай думкі, пранікнуць у старажытнае светаўспрыманне, убачыць тыя непасрэдныя сувязі, якія яднаюць жыццё рэальнае і міфічнае [4, с. 4], што ў сваю чаргу дазваляе прасачыць духоўныя каштоўнасці таго ці іншага народа. У культурнай антрапалогіі прынята падзяляць сферы культурных каштоўнасцей – побыт, ідэалогія, рэлігія і мастацкая культура [7, с. 20]. Але менавіта сфера побыту з'яўляецца першапачатковай і найбольш нязменнай крыніцай чалавечых каштоўнасцей. Яна займае вядучае месца для фарміравання асобы, таму што засвойваецца індывідам яшчэ ў дзяцінстве, больш за тое, яна захоўвае гістарычную памяць культуры і, такім чынам, змяшчае ў сабе "вечныя", агульначалавечыя і этнічныя каштоўнасці [7, с. 19]. Гэтыя каштоўнасці самадастатковыя, карыстанне імі аднымі дастаткова для жыцця ва ўмовах пэўнай культуры.

З гэтага пункту гледжання міфалогія выступае як крыніца жыццёвых арыенціраў. Казкі, і чарадзейныя казкі ў прыватнасці, уяўляюць неацэнную прастору для аналізу гэтых каштоўнасцей. Менавіта ў чарадзейных казках адлюстраваліся старажытныя вераванні народаў у існаванне звышнатуральных сіл: духаў, боствaў, чараўнікоў, нячыстай сілы і інш. [5, с. 3] Прычына таму – найбольш старажытнае паходжанне гэтага тыпу казак. Яны захоўваюць паняцці пра сацыяльныя інстытуты, абрады, народны характар, каштоўнасці ў жыцці асобнага чалавека. Такім чынам, мы сутыкаемся з асэнсаваннем як фінальных (агульначалавечых, найбольш важных для асобы), так і інструментальных (якія дазваляюць дасягнуць фінальных) і вытворных (якія сімвалізуюць фінальныя) каштоўнасцей [3, с. 51]. Па ходзе развіцця сюжэту казкі складваецца ўяўленне пра персанальныя каштоўныя якасці індывіда. Але разам з тым у чарадзейных казках паўстае вялікае поле артэфактаў (тут артэфакт – чароўны прадмет). Герой імкнецца атрымаць чароўную рэч, каб застацца верным слову, ці атрымлівае яе ад мудрага чарадзея-бацькі, каханай, сябра (чарадзея ці істоты, якой ён калісьці дапамог), каб гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чарадзейныя дары дапамагалі яму ў дарозе [5, с. 4]. Якраз беларуская міфалогія (як і чарадзейныя казкі) у гэтым сэнсе з'яўляецца найбольш старажытнай, не кранутай пазнейшымі напластаваннямі і самай не даследаванай з усіх славянскіх міфалагічных сістэм. Беларусы адчувалі кроўную, непарыўную еднасць з усёй прыродай, паэтычна "ачалавечваючы" не толькі жывёл і раслін, але і "нежывыя" прадметы (сякеру, дзяжу, печ і інш.) [4, с. 3]. Чарадзейнымі памочнікамі ў казках выступаюць шматлікія чароўныя прадметы (збан, абрус, рог, торба, тапор, дыван-самалёт і многія іншыя) [9, с. 20]. Такім чынам, у дадзеным артыкуле разглядаюцца шматлікія артэфакты з беларускіх чарадзейных казак як адлюстраванне пэўных каштоўнасцей беларускай культуры (фінальных, інструментальных, вытворных).

**Жыццё, здароўе.** Адной з найвялікшых каштоўнасцей для любога народа з'яўляецца жыццё (і звязанае з ім паняцце здароўя). У артэфактах захавальнікам і гарантыяй жыцця звычайна выступае вада. Так, у народных павер'ях вада – адна з першакрыніц жыцця, яна валодае цудадзейнай сілай, мае медыцынскія якасці. Але ў розных народаў яна выступае па-рознаму. Так, у іспанскіх казках яна ўяўляецца ў выглядзе бальзаму ("Нявеста трох жаніхоў"), у рускіх – жывой і мёртвай вады ("Іван-царэвіч"), у беларускіх – гаючай і жывой вады ("Іван Світаннік", "Залатое пяро", "Залаты птах"). Цікава, што ў большасці казак два тыпы вады знітаваны ў адно цэлае, спажыванне аднаго тыпу амаль немагчыма без выкарыстання другога. Залячыць раны адной гаючай вадой немагчыма, абавязкова патрабуецца дадаваць і ваду жывучую: "…у маёй хатцы на паліцы стаяць дзве пляшачкі з гаючаю і жывучаю вадою. Ты вазьмі іх, памаж дзеду вочы – ён і стане бачыць…", "…узяў іх [кавалкі з нагі] Іван, прыставіў на месца, папырскаў гаючай вадою і яны прыраслі; папырскаў жывучаю – зноў сталі такімі, як былі…" [5, с. 81]. Такім чынам, можна казаць, што для беларусаў паняцці "здароўе" і "жыццё" ўжываюцца ў цеснай сувязі, існаванне аднаго немагчыма без існавання другога.

**Дабрабыт.** Беларус абавязаны быць руплівым гаспадаром. Ён павінен мець добрую хату, багата накрыты стол, дастаткова грошай, дзяўчына павінна добра апранацца і г. д. У чарадзейных казках герой ці павінен адбудаваць прыгожы палац як адно з выпрабаванняў, ці атрымлівае пэўны спосаб змайстраваць добрае жыллё. Так, артэфактамі, якія дапамагаюць у будаўнічай справе, выступаюць сякерка цесляроў ("Тром-сын Безыменны"), чарадзейны пруток ("Аддай мне, што дома пакінуў"), залатыя, срэбраныя, медныя яйкі ("Падземнае царства"). Напрыклад, "спыніўся Тром-сын на беразе ракі і загадаў сякерцы пабудаваць за адну ноч палац, лепшы за царскі. А сам лёг спаць. Устае на досвітку, бачыць – стаіць новы палац, ды такі прыгожы – лепш за царскі…" [5, с. 100] ці "…дзеўка абышла кругом двара тры разы, а тады баднула пальцам у сцяну – увесь двор і зліўся ў залатое яйка…" [9, с. 126]. Сціплым і працавітым людзям у казках часта дастаюцца чарадзейныя прадметы, якія даюць багацце. Яны ў сваю чаргу падзяляюцца на два віды: забеспячэнне ежай ці грошамі. Да першай катэгорыі належаць шматлікія торбачкі ("З рога ўсяго многа", "Як мароз чалавеку нагарадзіў за пшаніцу") і рушнікі ("Янка і каралеўна"), настольнік купца ("Тром-сын Безыменны"). Торбачкі пры гэтым абмяжоўваюцца ежай і піццём, а рушнікі забяспечваюць і забаўляльную частку падчас прыёму ежы ("…ён страсянуў, дык з таго рушніка і піці, і есці, і музыка – чаго хочаш…" [9, с. 504]). Гэта дае падставу казаць пра культуру спажывання: ва ўяўленнях беларусаў недастаткова "наесціся да адвалу", а трэба яшчэ і сумяшчаць ядзенне з забаўкамі, паслухаць музыку ці пагутарыць з госцем, для прыкладу. Артэфактамі, якія забяспечваюць матэрыяльна, з'яўляюцца залаты пярсцёнак ("Прагны багацей"), кашалёк грошай ("Шкляныя горы", "Чарадзейныя яблыкі"), баранька (варыянт казкі "З рога ўсяго многа"). Трэба адзначыць, што грошай даецца столькі, каб было дастаткова для годнага існавання, але скнарнасць ці празмернае імкненне да багацця караецца. Напрыклад, у казцы "Прагны багацей" рыбіна даруе малодшаму беднаму брату пярсцёнак, які дае грошы, і малодшы брат выкарыстоўвае іх з розумам: будуе добрую хату, накрывае стол і нават дзеліцца ежай з суседзямі. А старэйшаму брату, які і без пярсцёнка быў багацеем, пры гэтым даволі скнарным, рыбіна адкусвае руку [5, с. 161]. Для дзяўчыны важна мець прыгожае адзенне, асабліва калі яна выходзіць замуж. Артэфактам, які сімвалізуе гэта, можна назваць тры арэхі ("Янка-стралец", "Аб каралевічу, чараўніку і яго дачцы") – "…разбіла Алена аб камень другі арэх, глядзіць – ажно сукня там такая прыгожая, як зоркі на небе" [5, с. 183].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

**Інстументальныя каштоўнасці.** Інструментальныя артэфакты цесна знітаваны з артэфактамі, якія забяспечваюць дабрабыт. Трэба адзначыць, што чарадзейныя прадметы на дабрабыт (як фінальную каштоўнасць) даюцца герою ці за пэўныя чалавечыя якасці і ўчынкі, ці праз інструментальныя прадметы, сімвал таго, што добры ўзровень жыцця трэба заслужыць, дасягнуць за старанную працу і шэраг добрых учынкаў, а не спадзявацца "на авось". Інструментальных артэфактаў вялікая колькасць, і яны паўтараюцца з казкі ў казку. Гэта кілім-самалёт ("Шкляныя горы", "Сын-адзінец"), армяк-невядзімец ("Шкляныя горы", "Сын-адзінец", "Чарадзейныя яблыкі"), малаток, які разбівае любыя ланцугі ("Бацькаў дар"), клубок з ніткамі, які паказвае дарогу ("Тром-сын Безыменны"), меч кладзянец ("Сын-адзінец"), срэбраная вуздэчка для розных абарачэнняў ("Васіль-чараўнік", "Чарадзейныя яблыкі") і інш. Гэтыя прадметы дзейнічаюць у звязцы, карыстацца імі трэба паслядоўна. Такім чынам праводзіцца паралель пра неабходнасць стараннай і цярплівай працы ў дасягненні мэты. Таксама пэўныя чарадзейныя рэчы ўяўляюць сімвалы магутнасці – такія рэчы, валоданне якімі павышае статус чалавека і сведчыць пра яго значнасць у соцыуме [6, с. 128]. Сярод іх вылучаюцца, напрыклад, у казцы "Тром-сын Безыменны", дубінка разбойніка, якая любыя войскі калоціць, залатая шкатулка ведзьмара, якая змяшчае вайсковыя сілы, настольнік купца, які забяспечвае ежай, сякера цесляроў, якая высякае любыя збудаванні. Гэтыя прадметы не проста дапамагаюць герою ў дасягненні мэты, але павышаюць яго статус, надзяляюць талентамі, дадаюць гонару і нават нахабства ("Паслаў цар за раку слугу: "Пакліч Тром-сына". […] Тром-сын кажа: "Невялікі твой цар пан: калі захоча, то сам мяне наведае". Хоць і не гонар цару самому да свайго конюха ехаць, ды рабіць няма чаго…" [5, с. 101]).

**Весялосць, талент.** У беларускім казачным эпасе вельмі значнае месца займаюць артэфакты, якія сімвалізуюць весялосць ці талент. Так, у вышэйзгаданай казцы пра Тром-сына больш каштоўнымі за ўсе рэчы-сімвалы магутнасці аказваюцца гуслі-самаграі, якія надаюць весялосць, добры настрой усім навокал, а таксама ствараюць забаўляльную і добразычлівую атмасферу, дзе галоўнае месца займаюць танцы і гумар. Галоўны герой казкі паслядоўна абменьвае гуслі на другія артэфакты, але нязменна разумее, што з гуслямі жыццё лепшае і іх нічога не заменіць, таму ён заўсёды знаходзіць спосаб вярнуць гуслі назад. Такім чынам, у старажытных беларускіх уяўленнях бадай што галоўнай каштоўнасцю лічылася весялоць, добры настрой і надзея, а значыць, і само мірнае жыццё, а не матэрыяльныя каштоўнасці ці ўлада. Асаблівае становішча гусляў-самаграяў падкрэсліваецца іх звышнатуральным паходжаннем – іх здабылі са дна акіяна, які з'яўляецца сімвалам таямнічаці і магічнасці. А астатнія прадметы (дубінка, шкатулка, настольнік, сякерка), хоць і валодаюць звышнатуральнымі якасцямі, але ўсё ж належаць зямным істотам – разбойніку, ведзьмару, купцу, цеслярам. Таксама пэўныя артэфакты сімвалізуюць талент, належнасць якога грае важную ролю ў сістэме каштоўнасцей беларусаў. Да іх належаць гуслі ("Гуслі"), дудачкі і скрыпка ("Музыка-чарадзей"). Але ў беларускіх чарадзейных казках падкрэсліваецца, што моц таленту дасягаецца не праз валоданне чарадзейнымі прадметамі, а праз самога чалавека, запал у яго душы. Цікава, што ў старажытных вераваннях лічылася, што талент дапамагае чалавеку ў жыцці. Так, у казцы "Гуслі" музыка сваім талентам нясе людзям радасць, карае чарцей і ведзьм як злых сіл, пазбягае смерці, якую магла прынесці зайздрасць [10, с. 516].

**Справядлівасць.** Са старажытнай маралі вынікае неабходнасць пакарання злачынца. Але трэба абмовіцца, што для старажытнага чалавека пакаранне праводзілася па традыцыі "праўды мяча". Адным з самых знакамітых артэфактаў, якія наводзяць справядлівасць, з'яўляецца рог ("З рога ўсяго многа"), з якога выходзяць малойцы і калоцяць вінаватых, пакуль не задаволіцца пакрыўджаны. Выбар для чарадзейнага прадмета рога не выпадковы. У беларускіх міфалагічных уяўленнях рог выступае як сімвал моцы і абароненасці [1, с. 428]. Другімі артэфактамі, якія выкрываюць злодзеяў лічыліся дудачкі і скрыпкі, якія зроблены з раслін, у якія ператварыўся забіты ("Чарадзейная дудка", "Чарадзейная скрыпка", "Як па ягадкі сястрычкі хадзілі", "Як дзве сястры забілі трэцюю", "Цудоўная дудка" [10, с. 420–430]). Такі ланцужок (душа ператвараецца ў расліну → з расліны робяць дудачку → дудачка сама спявае праўду → справядлівасць перамагае) зыходзіць з анімістычных уяўленняў у тое, што кроў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

бязвінна забітага не знікае, а праўда раней ці пазней адкрываецца і злачынцы выкрываюцца [2, с. 387].

**“Дзявочыя” артэфакты.** У казцы “Тром-сын Безыменны” чарадзейная Настасея-Прыгажуня загадвае герою здабыць два яе пасажныя артэфакты. Першы – залаты куфэрак, у якім – качка, а ў качцы – залатое яйка. Гэтае яйка – краса Настасеі. Другі – гуслі-самаграі, якія ўяўлялі весялосць Прыгажуні. Такім чынам, для беларусаў аднымі з важных станоўчых якасцей нявесты вызначаліся прыгажосць і весялосць. Трэба адзначыць, што падобныя артэфакты звычайна даставаліся са дна мора ці акіяна (пасажны куфэрак Дзеўкі-Паланянкі – “Залатое пяро”; залаты куфэрак Настасеі-Прыгажуні – “Тром-сын Безыменны”), што падкрэслівае статус вады як жаночай стыхіі. Адзначаюцца вераванні аб сувязі вады і кахання: беларускія багіні кахання заўсёды мелі дачыненне да вод (апякункі рэк, крыніц і г. д.) [1, с. 58].

**Анімістычныя ўяўленні.** У старажытным светапоглядзе важная роля адводзілася душы істоты. Паводле вераванняў беларусаў, яна часткова знаходзілася ў валасах, пазногцях, адзенні і г. д. Лічылася, што праз гэтыя рэчы можна ўздзейнічаць на чалавека. У чарадзейных казках падобнымі спосабамі героі выклікаюць сваіх памочнікаў. Часам дастаткова дастаць чарадзейную рэч і падумаць пра яе ўладальніка, каб ён аб’явіўся перад табой, а другім разам трэба развесці цяпельца і ўкінуць у яго гэты чарадзейны прадмет. Артэфактамі-ўтрымальнікамі душы называюцца шалупайка з хваста рака (“Шкляныя горы”), пёрка дзятла (“Шкляныя горы”), пёрка з крыльца мурашкі (“Шкляныя горы”), шэрсць воўка (“Шкляныя горы”), шарсцінка са скуры льва (“Сын-адзінец”), лускавінка велярыба (“Сын-адзінец”), пярынка панічаарла (“Сын-адзінец”) і г. д. Для чалавека адным з найважнейшых варыянтаў уздзеяння з’яўляецца крадзеж адзежы. Напрыклад, у казцы “Шкляныя горы” дзяўчына не магла больш ператварацца ў галубку, бо герой адабраў у яе сукенку, і яна была вымушана пайсці за яго замуж.

**Веды.** Атрыбутамі ведаў выступаюць самі веды, а таксама памяць. Напрыклад, цар з казкі “Сіняя світа, налева пашыта” валодае чарадзейнай кнігай, якая апавядае яму пра ўсё, што дзеецца ў свеце. Артэфактамі ўзгадваюцца яблыкі і грэбень. Так, у казцы “Янка-стралец” да героя вяртаецца памяць, калі ён расчэсвае валасы чарадзейным грэбнем. А ў казцы “Залатая яблынька” гераіня вяртае не толькі памяць, але і жыццё пасля таго, як адкусіла залатога яблычка. Гераіня вярнулася да мужа і дзіця. Такім чынам, у вераваннях беларусаў назіраецца сувязь яблыні і дрэва жыцця, яблыні і душаў жанчын і дзяцей [1, с. 575].

**Артэфакты злых сіл.** Беларускія чарадзейныя казкі даюць прыклады і антыкаштоўнасцей. Так, як і бадай што ва ўсіх народаў, беларусы асуджаюць забойствы, гвалт, нянавісць – таўкачы, якімі чорт ці Кашчэй збіваюць людзей да смерці (“Іван Світаннік”). Асуджаецца падман – сонныя аладкі, якія пячэ Баба-Яга, каб абдурыць героя і не выканаць сваё абяцанне (“Шкляныя горы”). Цікава, што асуджэнне адмоўных якасцей персанажаў можа адбывацца праз лішэнне іх тых артэфактаў, якія яны жадаюць атрымаць. Напрыклад, прагны пан замест торбачкі з багаццем атрымлівае рог, праз які яго збіваюць да паўсмерці (“З рога ўсяго многа”), ці зайздроснаму багатаму старэйшаму брату замест пярсцёнка, які даруе багацце, рыбіна адкусвае руку (“Прагны багацей”).

**Шматфункцыянальныя артэфакты.** У беларускіх чарадзейных казках адзін і той жа прадмет можа валодаць некалькімі функцыямі, а адны і тыя ж рэчы ў розных абставінах маюць розныя якасці. Гэта можна патлумачыць уяўленнем пра сувязь пэўных каштоўнасцей і пра непарыўнае іх суіснаванне, а таксама тым, што адны і тыя ж каштоўнасці для розных людзей у розных абставінах набываюць розныя значэнні. Так, жывая і гаючая вада выступаюць адначасова як сімвалы жыцця і здароўя, у той жа час яны надаюць свайму ўладару пры карыстанні імі прыгажосць ці могуць ужывацца ў кулінарыі як вытанчаная заправа (“Залаты птах”). Напрыклад, “…і стаў Іван такі прыгожы… […] Але бацька цяпер цябе не пазнае, бо ты змяніўся ад жывой вады…”, “… уліў у кожную страву жывой вады… […] Гэта ж тут адзін хлопец у мяне за памочніка быў, дык ён і наварыў такіх смачных страў…” [5, с. 227]. Залатая табакерка з казкі “Ох і залатая табакерка” забяспечвае героя як ежай, так і дазваляе ўпраўляцца з разнастайнай будаўнічай справай праз чалавечка, які сядзіць у табакерцы. Хустачкі ў першую чаргу выступаюць як сімвалы харчовага дастатку (“Янка і каралеўна”), так і багатага жылля (“Іван Світаннік”) ці нават здымаюць сон (“Тром-сын Безыменны”). Пяро жар-птушкі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якое героям трэба здабыць у шматлікіх казках, з аднаго боку, забяспечвае яго ўладальніка добрым асвятленнем (“Залатое пяро”, “Залаты птах”), а з іншага – дапамагае даглядаць коней (“Тром-сын Безыменны”). Розныя чароўныя кіёчкі і дубчыкі дапамагаюць будаваць жыллё, дасягаць справядлівасці ці нават ажыўляць мёртвых ці здымаць чары (“Шэсць рыбін”, “Ведзьма-зладзейка”, “Аддай мне, што дома пакінуў”, “Тром-сын Безыменны”).

Пэўныя артэфакты з’яўляюцца падобнымі ў розных культурах, не абавязкова паўтараецца сам прадмет, але застаюцца аднолькавыя якасці. Напрыклад, беларускае пяро з хваста жар-птушкі знаходзіць свой аналаг у дацкай казцы “Малёк” у выглядзе чароўнага свяцільніка. У іспанскай казцы “Нявеста трох жаніхоў” жывая і гаючая вада падаюцца ў выглядзе бальзаму: “…бальзам быў не просты, а чарадзейны. […] …гэтым бальзамам можна не толькі загойваць раны, але і ажыўляць мёртвых…” [8, с. 110]. Кілім-самалёт – у выглядзе скрыні, але апошняя мае больш уласцівасцей: “Мая скрыня плавае па хвалях, лётае па паветры, сама бяжыць па зямлі, і не паспее камень, кінуты ў хвалі, дасягнуць марскога дна, як скрыня перанясе цябе і тваіх сяброў куды ты толькі ёй ні пажадаеш…” [8, с. 111]. У румынскай казцы “Лекар Тодэраш” знаходзім чароўны рог: “Калі будзе табе блага – патрубі ў яго, і збярэцца вакол цябе раць незлічоная, зямля ходырам заходзіць. А ў другі канец падзьмеш – і няма нікога…” [8, с. 214]. Там жа знаходзім і кашалёк, які дае багацце. У швейцарскай казцы “Хрустальны калодзеж” вядзьмарка мае чароўную палачку, якая падобна па функцыях да беларускіх дубца і кіёчка (асноўнае выкарыстанне – у будаўніцтве), але, тым не менш, швейцарская палачка здольна тварыць і многія іншыя цуды. Такім чынам, можна казаць, што для розных народаў існуюць адзіныя агульначалавечыя каштоўнасці: жыццё, здароўе, справядлівасць, дабрабыт і г. д. Але разам з тым у кожнага народа вылучаецца свая сістэма каштоўнасцей, якія набываюць мясцовую культурную афарбоўку і адрозніваюцца па ступені значнасці ў жыцці індывіда.

**Высновы.** На прыкладзе артэфактаў з беларускіх чарадзейных казак бачна, што міфалогія адлюстроўвае культурныя каштоўнасці менталітэту народа. Менавіта каштоўнасці складаюць ядро нацыянальнай культуры і кіруюць паводзінамі індывіда ў тых ці іншых абставінах. Гэтыя каштоўнасці выпрацоўваліся стагоддзямі і з’яўляюцца самадастатковымі, карыстанне імі аднымі дастаткова для жыцця ва ўмовах пэўнай культуры. Цікава, што ў казках мы знаходзім тыя самыя культурныя каштоўнасці, якімі павінны кіравацца людзі і сёння, што сведчыць аб фальклоры як аб захавальніку гістарычнай памяці народа. У беларускіх чарадзейных казках даецца ўяўленне як пра станоўчыя каштоўнасці, так і пра антыкаштоўнасці, што сведчыць пра ўсебаковую распрацаванасць гэтай тэматыкі ў беларускай міфалогіі. Падаюцца таксама першыя анімістычныя вераванні. Такім чынам, можна казаць пра існаванне сістэмы каштоўнасцей у беларускай міфалогіі, яе старажытнасць, сувязь з паўсядзённай культурай этнасу і прыналежнасць да сусветных міфалагічных уяўленняў.

## Літаратура

1. Беларуская міфалогія : Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Беларускі фальклор : Энцыклапедыя ў 2 т. Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – Яшчур / уклад. А. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. – 832 с.

3. Кармин, А.С. Основы культурологии: морфология культуры : Учебник для вузов / А.С. Кармин. – СПб. : Лань, 1997. – 512 с.

4. Коваль, У.І. Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы : Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль. – Гомель, Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.

5. Музыка-чарадзей : Беларускія народныя чарадзейныя казкі / уклад. А.І. Гурскі. – Мінск : Юнацтва, 1995. – 271 с.

6. Персикова, Т.Н. Межкультурная коммуникация и корпоративная культура : Учебное пособие / Т.Н. Персикова. – М. : Логос, 2007. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

7. Садохин, А.П. Введение в теорию межкультурной коммуникации / А.П. Садохин. – М. : Высшая школа, 2005. – 310 с.

8. Хрустальны калодзеж : Казкі народаў Еўропы / пер. на бел. мову В. Гардзей. – Мінск : Юнацтва, 1996. – 367 с.

9. Чарадзейныя казкі : у 2 ч. Ч. 1 / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, рэд. выд. В.К. Бандарчык. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 639 с. (Беларуская народная творчасць)

10. Чарадзейныя казкі : у 2 ч. Ч. 2 / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, рэд. выд. В.К. Бандарчык. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 639 с. (Беларуская народная творчасць)

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 04.02.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины